Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

**Дэма-версія практычнага задання для экзамена па гісторыі Беларусі, для навучэнцаў 9-х класаў (2022/2023 навучальны год). Білет 18. Варыянт 7. Ч.2**

**Білет № 18. Практычнае заданне. Культура Беларусі ў XIX - пачатку XX ст. Умовы і асаблівасці фармавання беларускай нацыі.**

**Заданні склала:** Руцкая Л.А., ДУА "Сярэдняя школа № 148 г. Мінска"

**З апорай на прадстаўленыя крыніцы, адкажыце на наступныя пытанні:**
1. Вызначыце, калі пачала выходзіць легальная беларуская штотыднёвая газета “Наша Ніва”?
2. Растлумачце, выкарыстоўваючы даныя табліцы, у якіх навучальных установах мелі патрэбу беларускія губерні больш за ўсё?
3. Пацьвердзіце цытатамі з крыніцы, што галоўная мэта газеты «Наша Ніва» - фармаванне нацыянальнай самасвядомасці беларусаў.
4. Дакажыце, абапіраючыся на крыніцы, што ў XIX – пачатку XX ст. былі створаны ўмовы для фармавання беларускай нацыі.

**Крыніца І.**
**З звароту да чытачоў рэдакцыі газеты “Наша Ніва” № 1 (10 лістапада 1906 г.)**

Пачынаючы выдаваць беларускую газету "Наша Ніва", хочам … адкрыць свае думкі, каб усе маглі нас пазнаць…

Мы будзем служыць усяму беларускаму скрыўджанаму народу, пастараемся быць люстрам жыцця, каб ад нас, як пекла люстра, свет падаў у цёмнасць... Мы будзем браць усё ад усіх і, злажыўшы ў парадак, зноў аддаваць. Ведайце добра, што "Наша Ніва" газета не рэдакцыі, а ўсіх беларусаў і ўсіх тых, хто ім спагадае. Кожны мае права быць выслуханым на старонках нашай газеты і кіраваць ёю, толькі каб было разуменне. Мы са сваёй стараны будзем старацца, каб усе беларусы, што не ведаюць, хто яны ёсць, зразумелі, што яны беларусы і людзі, каб пазналі свае правы і памаглі нам у нашай працы.

**Крыніца ІІ.**
Колькасць навучальных устаноў у беларускіх губернях, 1911 г.

| Губерня | Агульная колькасць навучальных устаноў | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | вышэйшых | | | сярэдніх | | | ніжэйшых |
| | муж | жан | ўся-га | мужч. | жаноч. | усяго | |
| Віцебская | | | | 4 | 7 | 11 | 117 |
| Гродзенская | | | | 4 | 3 | 7 | 113 |
| Мінская | | | | 9 | 3 | 12 | 111 |
| Магілёўская | | | | 12 | 4 | 16 | 64 |
| Віленская | | | | 10 | 2 | 12 | 254 |

Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

**Крыніца III**

**М.Сіліванові́ч «Стары пастух» канец XIX ст.**

